Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

11 чэрвеня 2018 года, № 10 (2198)

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Намеснік старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Ван Цішань наведаў БДУ. Высокі госць сустрэўся з рэктарам Андрэем Каралём, першым прарэктарам акадэмікам Алегам Івашкевічам, дырэктарам РІКК Анатоліем Тозікам і дэканам факультэта міжнародных адносін Віктарам Шадурскім.

Зрабіць БДУ правадыром для кітайскіх ВНУ ва Усходняй Еўропе

Упарадак візіту было ўключана азнаямленчае наведванне падраздзяленняў БДУ. Ван Цішаня цікавіла гісторыя і сучаснасць першай ВНУ Беларусі, яе культурна-гістарычная спадчына. Знаёмства з БДУ пачалося з фундаментальнай бібліятэкі, якая з'яўляецца найстарэйшай і найбуйнейшай на тэрыторыі Беларусі. Сёння яе віртуальная версія ўваходзіць у сотню найлепшых бібліятэк свету. Кітайскаму госцю распавялі пра асноўныя этапы станаўлення бібліятэкі і адзначылі, што першым дырэктарам гэтай унікальнай установы была перакладчыца «Капітала» Карла Маркса на рускую мову Яўгенія Гурвіч. Дарэчы, Ван Цішань у БДУ наведаў выставачную экспазіцыю кніг, прымеркаваную да 200-годдзя вялікага мысляра Карла Маркса, дзе былі прадстаўлены арыгінальныя выданні, датаваныя пачаткам XX стагоддзя.

Працягнуўся візіт Ван Цішаня наведваннем музея гісторыі БДУ. Госця пазнаёмілі з летапісам першага беларускага ўніверсітэта і праз тэматычныя экспазіцыі паказалі адмысловую місію БДУ ў фарміраванні і станаўленні вышэйшых і навуковых школ Беларусі, распавялі пра ўдзел прафесараў ВНУ ў стварэнні міжнароднай арганізацыі ААН і сусветныя навуковыя адкрыцці навукоўцаў БДУ.

Ван Цішань таксама выказаў жаданне наведаць адзін са шматлікіх музейных комплексаў БДУ. У музеі землязнаўства госцю прадставілі адзіныя калекцыі дзівосных і непаўторных мінералаў, горных парод і палеанталагічных экспанатаў і прапанавалі прайсціся па «геалагічнай алеі».

Сяброўскі абмен уражаннямі і перспектывамі супрацоўніцтва адбыўся за круглым сталом. Ван Цішань падкрэсліў, што Беларусь адна з краін, дзе на вышэйшым дзяржаўным узроўні надаецца вялікае значэнне развіццю адукацыйнай сістэмы, і гэта відаць па стаўленні кіраўніка дзяржавы, які часта наведвае БДУ. Ван Цішань адзначыў дальнабачнасць і правільнасць такой пазіцыі, якая прыводзіць да сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў цэлым. Рэктар БДУ Андрэй Кароль падзякаваў намесніку старшыні КНР за высокую ацэнку і канстатаваў, што спыняцца і ганарліва сузіраць вынікі – гэта шлях назад. «Трэба імкнуцца наперад. Адна з фундаментальных думак вялікага кітайскага філосафа Канфуцыя – гэта рухацца. І на дадзеным этапе развіцця БДУ мы аналізуем: «Хто мы ёсць?» Згодзен з Вашым меркаваннем, што ў любой справе галоўнае – гэта чалавек», – адзначыў Андрэй Кароль. Таксама кіраўнік БДУ падзяліўся найбліжэйшымі планамі па паглыбленні і пашырэнні беларуска-кітайскіх сувязяў. Стратэгічнай задачай з'яўляецца імкненне зрабіць БДУ ў маштабах Усходняй Еўропы пляцоўкай, правадыром па ўзаемадзеянні з кітайскімі ВНУ. На парадку дня таксама падвядзенне вынікаў першага года працы беларуска-кітайскага сумеснага інстытута, створанага БДУ і Далянскім політэхнічным універсітэтам, і падпісанне з ім дадатковай фінансавай дамовы. Плануецца адкрыць сумесна з Далянскім політэхнічным універсітэтам Інстытут дыстанцыйнага навучання.

Знаёмства з БДУ завяршылася экскурсіяй па галерэі ўніверсітэта, прысвечанай выбітным асветнікам Беларусі і сусветна вядомым мыслярам, у шэрагу якіх вялікі кітайскі філосаф Канфуцый.

Наведванне БДУ прайшло ў рамках трохдзённага візіту намесніка старшыні КНР Ван Цішаня ў Беларусь. Для яго гэта першая дыпламатычная паездка за межы радзімы пасля абрання на пост.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

У нумары:

ВОСЕМ ЗАДАЧ ДЛЯ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ
Падрыхтоўку журналісцкіх кадраў абмеркавалі на круглым стале ў БДУ
Стар. 3

ГІСТОРЫЮ ЧАСТА НАЗЫВАЮЦЬ ПАЛІТЫКАЙ, ЗВЕРНУТАЙ НАЗАД
Інтэрв'ю з дырэктарам Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Анатоліем ТОЗІКАМ
Стар. 6

BIZTECH–2018
Навучанне праз практычны досвед стварэння высокатэхналагічнага міжнароднага бізнесу
Стар. 7

Весткі з рэктарата

ДЭЛЕГАЦЫЯ канцылярыі знешніх сувязяў урада правінцыі Ганьсу (КНР) наведала БДУ. Узначаліў яе начальнік цэнтра па справах стажыровак і навучання за мяжой **Чжаа Цзюнь**. Адбылася сустрэча з прарэктарам па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях **Вольгай Чупрыс** і дэканам факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі **Ганнай Басавай**.

Мэтай візіту стала абмеркаванне праекта дамовы аб супрацоўніцтве паміж БДУ і канцылярыяй знешніх сувязяў урада правінцыі Ганьсу па арганізацыі на ФПКП праграм павышэння кваліфікацыі для розных катэгорый кітайскіх слухачоў.

«Нас цікавяць адукацыйныя праграмы для перакладчыкаў, спецыялістаў знешнегандлёвай дзейнасці, выкладчыкаў універсітэтаў і бізнесменаў правінцыі Ганьсу», – падкрэсліў Чжаа Цзюнь.

ВЯДОМЫ сірыйскі палітычны дзеяч і бізнесмен **Хасан Аль Нуры** сустрэўся з прарэктарам па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі **Сяргеем Ходзіным**. Мэтай візіту ў БДУ стала ўсталяванне супрацоўніцтва ў адукацыйнай і інвестыцыйнай сферах.

БДУ і Мальтыйскі ўніверсітэт падпісалі дзве дамовы аб супрацоўніцтве.

Першая закранае абмен студэнтамі, магістрантамі і выкладчыкамі, правядзенне сумесных даследчых і адукацыйных праектаў.

Другая дамова падпісана паміж ФПМІ і факультэтам інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій Мальтыйскага ўніверсітэта аб узаемадзеянні ў навуковай і навучальнай сферах.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

НАВАЦЫІ

didact.bsu.by

Партал у эўрыстычнае навучанне

Міжуніверсітэцкі адукацыйны партал «Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі» створаны ў БДУ. Гэта адкрытая інтэрактыўная інтэрнэт-пляцоўка з магчымасцю дыстанцыйнага ўдзелу ў яе працы ўсіх ахвотнікаў. Партал стане кропкай росту сістэмы крэатыўнай адукацыі, будзе спрыяць фарміраванню зместу, мэт, формаў, метадаў і крытэрыяў ацэньвання навучальных заняткаў.



Функцыянаванне рэсурсу накіравана на развіццё адукацыйнага творчага асяроддзя, перабудову дзейнасці ўстаноў адукацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі мадэляў універсітэта 3.0–4.0. Дадзеныя мадэлі патрабуюць новых эўрыстычных якасцяў выкладчыка, якія дазволяць індывідуалізаваць навучальны працэс і стварыць умовы для самарэалізацыі навучэнца.

Творчыя метады сёння выкарыстоўваюцца ў навучанні, але толькі ў рамках інфармацыйнага падыходу. Трансляцыйны характар адукацыі заснаваны на перадачы навучэнцу педагагічна адаптаванага сацыяльнага досведу, што дэматывуе вучня, не развівае ў ім асабістыя якасці і імкненне да самазмянення з улікам новых патрабаванняў.

Для падрыхтоўкі спецыялістаў, у якіх зацікаўлены працадаўцы, неабходна творчая сістэма адукацыі, змена яе характару з маналагічнага на дыялагічны. Патрабуецца іншая метадалогія навучання – вучыць навучэнца не браць «чужое», а ствараць уласны адукацыйны прадукт, арыентаваны на дасягненні чалавецтва па кожнай канкрэтнай тэме.

У наш час партал акумулюе вынікі праведзеных у лютым–маі ў Беларусі семінараў вочна-дыстанцыйнага аргдзейнаснага курса «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава». Яго ўдзельнікамі сталі звыш 250 педагогаў і выкладчыкаў БДУ, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Ліцэя БДУ і чатырох рэспубліканскіх каледжаў. Да працэсу абмеркавання пытанняў крэатыўнага навучання былі далучаны ключавыя звёны ўсіх ступеняў адукацыі – агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай. Фота, відэаматэрыялы, асноўныя рэфлексіі і найлепшыя інавацыйныя метадычныя распрацоўкі размешчаны ў частках дадзенага рэсурсу.

Варта адзначыць, што галоўным вынікам дыстанцыйнага аргдзейнаснага курса стала змена ў многіх выкладчыкаў падыходаў да навучання, пашырэнне практыкі прымянення інавацыйных метадаў у адукацыйным працэсе. «З'явіўся новы погляд на рашэнне праблем навучання, разуменне неабходнасці пашырэння арсенала сродкаў навучання студэнтаў», – адзначыў член-карэспандэнт НАН РБ, загадчык кафедры канстытуцыйнага права **Рыгор Васілевіч**. Загадчыца кафедры экалогіі чалавека факультэта сацыякультурных камунікацый **Ірына Панцюк** падкрэсліла: «Зараз ведаю, як магу яшчэ праводзіць заняткі, каб «не губляць» студэнта». Аспірантка **Наталля Кісель** адзначае: «Падчас працы ў мяне з'явілася такая асацыяцыя, што я, як барон Мюнхгаўзен, які ўзяў сябе за валасы і выцягнуў сам сябе з балота. Чаму з'явілася гэта асацыяцыя? Напэўна, таму, што я інакш зірнула на адукацыйны працэс».

На партале педагогі любой установы адукацыі Беларусі змогуць падзяліцца сваімі публікацыямі, ідэямі, інавацыйнымі метадычнымі распрацоўкамі. Тут будуць размяшчацца і праводзіцца ў анлайн-рэжыме тэматычныя вэбінары, круглыя сталы, семінары і канферэнцыі. На анлайн-пляцоўцы будуць ініцыяваны дыскусіі па пытаннях «навошта вучыць», «чаму вучыць» і «як вучыць», абмеркаванні зместу адукацыйных стандартаў, навучальных праграм, тэхналогій навучання. Адмысловую ўвагу плануецца надаваць аналізу педагагічнай практыкі.

Вынікам дзейнасці партала стане калектыўная распрацоўка рэкамендацый і прапаноў па карэкціраванні адукацыйных стандартаў, навучальных праграм з улікам патрабаванняў, якія прад'яўляюцца сёння, да падрыхтоўкі спецыяліста.

Структурна партал складаецца з частак: «Навіны», «Пляцоўка дыялогу», «Мерапрыемствы», «Галерэя», «Рэфлексіі», «Тэзаўрус».

Да ўдзелу ў працы дадзенага міжуніверсітэцкага інфармацыйнага рэсурсу запрашаюцца выкладчыкі, студэнты, даследчыкі, а таксама ўсе зацікаўленыя ў развіцці сучаснай універсітэцкай адукацыі.

Партал створаны па ініцыятыве і на базе БДУ. ВНУ-партнёрамі выступаюць: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь; Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы; Далянскі політэхнічны ўніверсітэт (КНР). Навуковым рэдактарам з'яўляецца рэктар БДУ доктар педагагічных навук **Андрэй Кароль**. Тэхнічную распрацоўку і падтрымку партала ажыццяўляе Цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

КАНТАКТЫ

Пачынаем супрацоўнічаць з універсітэтам Бардо

Рэктар БДУ **Андрэй Кароль** у складзе дэлегацыі Міністэрства адукацыі Беларусі на чале з міністрам адукацыі **Ігарам Карпенкам** прыняў удзел у працы Канферэнцыі міністраў краін Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі.

Удзельнікі абмеркавалі пытанні развіцця беларускай сістэмы вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з прынцыпамі агульнаеўрапейскай прасторы, а таксама разглядзелі ўзаемавыгадныя фарматы супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Еўрасаюзам у адукацыйнай сферы. Гэта значнае мерапрыемства, якое прадугледжвае ўмацаванне канкурэнтаздольнасці нацыянальнай адукацыі і яе інтэграцыю ў сусветную адукацыйную прастору.

У рамках канферэнцыі рэктар БДУ Андрэй Кароль правёў сустрэчы з кіраўніцтвам Міністэрства адукацыі Францыі і французскіх адукацыйных устаноў. Ён таксама наведаў Універсітэт Парыж-Саклі, названы «Французскай сіліконавай далінай». Гэта шматпрофільны ўніверсітэт, які аб'ядноўвае тры ўніверсітэты, сем даследчых цэнтраў, дзевяць буйных інжынерных і бізнес-школ.

Таксама кіраўнік БДУ наведаў французскае адукацыйнае агенцтва Campus France, дзе бакі абмяняліся прафесійным досведам па прасоўванні адукацыйных паслуг за мяжой і абмеркавалі пытанні міжнароднай студэнцкай мабільнасці.

Адным са значных вынікаў стала падпісанне дамовы пра супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Універсітэтам Бардо. Дадзены дакумент умацуе шматгадовыя партнёрскія адносіны паміж краінамі і забяспечыць умовы для рэалізацыі новых сумесных праектаў. У прыватнасці, мемарандум прадугледжвае пашырэнне напрамкаў супрацоўніцтва ў адукацыйнай, навуковай сферах і мяркуе ўкараненне ў навучальны працэс сумеснай магістратуры на англійскай мове па міжнародным эканамічным праве на ФМА БДУ і юрыдычным факультэце Універсітэта Бардо.

Адзначым, у БДУ вядзецца актыўная праца па ўзмацненні супрацоўніцтва з французскімі ўстановамі адукацыі. У наш час дзейнічаюць партнёрскія дамовы з Універсітэтам Парыж I Пантэон-Сарбона; Універсітэтам Заходні Парыж – Нантэр-ля-Дэфанс; Універсітэтам Пуацье; Цэнтрам дыпламатычных і стратэгічных даследаванняў; Універсітэтам усходніх моў і цывілізацый; Цэнтральнай школай Ліёна. Рэалізуюцца праекты ў галіне навуковага, навукова-тэхнічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Перспектывы будаўніцтва навучальнага корпуса БДУ

Філіялы пекінскага інфармацыйна-адукацыйнага цэнтра БДУ будуць адкрыты ў правінцыі Шэнсі і на базе тэхнапарку Лаянскага політэхнічнага ўніверсітэта (КНР). Адпаведныя дамовы падпісаны ў рамках візіту нашай дэлегацыі на чале з прарэктарам па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці **Міхаілам Чарапеннікавым.**

Дзейнасць філіялаў будзе накіравана на падрыхтоўку кітайскіх грамадзян да паступлення ў БДУ і іншыя ўстановы вышэйшай адукацыі нашай краіны. Акрамя таго, кітайскія калегі будуць арганізоўваць наборы слухачоў на курсы рускай мовы як замежнай. Каардынаваць працу дыстанцыйнага навучання рускай мове будуць прадстаўнікі беларускага аддзялення – выкладчыкі факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ.

Беларуская дэлегацыя наведала шэраг кітайскіх устаноў з мэтай пашырэння адукацыйных і культурных сувязяў паміж дзвюма краінамі. У прыватнасці, падпісана дамова пра стратэгічнае партнёрства паміж БДУ і Лаянскім політэхнічным універсітэтам. Дакумент прадугледжвае абмен студэнтамі, выкладчыкамі, навуковай інфармацыяй, матэрыяламі і публікацыямі.

Прадстаўнікі БДУ прынялі ўдзел у працы кантактна-кааперацыйнай біржы. Яе ўдзельнікамі сталі супрацоўнікі адукацыйных устаноў, навуковых і прамысловых арганізацый правінцыі Хэнань. Прайшла прэзентацыя эканамічнага, адукацыйнага і навуковага патэнцыялу Беларусі і БДУ. Бакі абмеркавалі пытанні сумеснага правядзення даследаванняў, арганізацыі выпуску навукаёмістай прадукцыі, узаемадзеяння з прадпрыемствамі-рэзідэнтамі кітайска-беларускага індустрыяльнага парку «Вялікі камень».

У рамках візіту ў Кітай адбыліся сустрэчы з кіраўніцтвам упраўленняў адукацыі адміністрацыі гарадоў Хандань і Сінтай, Трэцяй вышэйшай школы (Ханьдань), адукацыйнай карпарацыі «Ханьданская вышэйшая школа замежных моў». Ключавымі тэмамі абмеркавання былі заяўлены перспектывы супрацоўніцтва, магчымасці накіравання выпускнікоў школ і студэнтаў на навучанне ў БДУ, арганізацыя сумеснай падрыхтоўкі навучэнцаў рускай мове.

Праграма афіцыйнага візіту ўключала ўдзел у розных мерапрыемствах, сярод якіх семінар з дырэктарамі 11 вышэйшых школ г. Сінтай. Прадстаўнікі БДУ прэзентавалі адукацыйную дзейнасць нашага ўніверсітэта і распавялі пра перавагі атрымання вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Таксама дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у працы адукацыйна-інвестыцыйных форумаў у правінцыях Хэбэй і Хэнань (КНР), адукацыйным форуме з удзелам Асацыяцыі кітайскіх выпускнікоў пасляўніверсітэцкіх праграм навучання і кіраўніцтва навукова-тэхнічнай карпарацыі «Лі Вэй» (г. Лаян). Тут былі праведзены перамовы па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі, а таксама магчымасцяў удзелу кітайскіх партнёраў у інвестыцыйных праектах БДУ. Была дасягнута дамоўленасць пра візіт фундатараў у жніўні-верасні 2018 года ў Мінск для дэталёвага абмеркавання праекта будаўніцтва навучальнага корпуса БДУ.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

ВАЖНЫЯ РАШЭННІ

Восем задач для факультэта журналістыкі

Пытанні падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў абмеркавалі на круглым стале «Стратэгічнае партнёрства ў сферах медыявытворчасці і масавых камунікацый» у БДУ.

Пасяджэнне прайшло на факультэце журналістыкі БДУ з удзелам першага намесніка міністра інфармацыі **Паўла Лёгкага,** рэктара БДУ **Андрэя Караля,** прарэктара па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях ВНУ **Вольгі Чупрыс,** кіраўнікоў вядучых беларускіх СМІ, а таксама прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта.

Гэтая сустрэча кіраўніцтва БДУ з прадстаўнікамі прафесійнай супольнасці выклікана запатрабаваннем напаўнення новым кантэнтам падрыхтоўкі журналістаў з мэтай далейшага якаснага развіцця журналісцкай галіны ў Беларусі.

У фармаце круглага стала прайшла актыўная дыскусія па пытаннях навучання будучых журналістаў, пошуку механізмаў і формаў узаемадзеяння з заказчыкамі кадраў, актывізацыі супрацоўніцтва з патэнцыйным спажыўцом навукова-адукацыйных паслуг факультэта. Паднятыя праблемы разгледзелі ў разрэзе трох узаемазвязаных аспектаў: змястоўнага, арганізацыйнага і навуковага.

Разглядаліся пытанні сучасных кампетэнцый, навыкаў і ўменняў выпускніка факультэта. Многім бачыцца запатрабаванасць спецыяліста ў яго творчай універсальнасці, уменні працаваць у розных інфармацыйных асяроддзях і камунікацыйных палях. Адным з агучаных рашэнняў дадзенай праблемы з'яўляецца змена змястоўнага кампанента навучальных праграм. Рэктар Андрэй Кароль, каментуючы прапанаваныя ідэі, падкрэсліў неабходнасць пашырэння і ўкаранення ў адукацыю новых методык і тэхналогій для раскрыцця творчага патэнцыялу студэнта. «Матывацыя да вучобы залежыць ад магчымасцяў самарэалізацыі. Адной са стратэгічных мэт у БДУ з'яўляецца стварэнне адукацыйнага асяроддзя, якое дазволіць кожнаму студэнту выявіць і раскрыць свой патэнцыял сродкамі навучальных прадметаў», – сказаў Андрэй Кароль.

Пытанне ўзаемадзеяння з заказчыкам кадраў закранула тэму выканання курсавых, дыпломных і магістарскіх праектаў. Іх мэтазгоднасць відавочная пры замове гэтых прац спажыўцамі, патэнцыйнымі працадаўцамі. Разглядаючы незапатрабаванасць навуковых даследаванняў факультэта, першы намеснік міністра інфармацыі Павел Лёгкі падкрэсліў, што сёння міністэрству бракуе медыяметрычнага аналізу сучасных медыя. «Гэта навуковая галіна не развіваецца ў нашай краіне, а нам важна разумець і бачыць усе рухі і змены, якія адбываюцца ў медыяпрасторы», – дадаў Павел Лёгкі. Была прынята прапанова распрацаваць пералік прыярытэтных тэм навуковых даследаванняў і стварыць сумесна з саветам маладых навукоўцаў эксперыментальны даследчы цэнтр медыяметрыі.

Адмысловую ўвагу надалі абмеркаванню праходжання практыкі студэнтамі. Гучалі розныя пункты гледжання адносна аптымальнага балансу тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі журналістаў. «Відавочна, што падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў для нацыянальнай журналісцкай галіны з'яўляецца агульнай задачай БДУ і прафесійных СМІ», – рэзюмавала в. а. дэкана факультэта журналістыкі **Вольга Самусевіч.**

Да цяперашняга часу адкрытым таксама заставалася пытанне назвы факультэта БДУ. Удзельнікі калегіяльна прынялі рашэнне пра захаванне вядомай назвы, якая ўжо стала брэндам, – факультэт журналістыкі.

Вынікам круглага стала стала прыняцце васьмі рашэнняў, якія тычацца змястоўнага, адукацыйнага і навуковага кампанентаў падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў. Іх рэалізацыя пачнецца з верасня бягучага года. Таксама плануецца, што працоўныя сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ па актуальных пытаннях медыяадукацыі будуць праходзіць на рэгулярнай аснове.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

МІЖНАРОДНАЯ ПАВЯЗЬ

Рэгіянальная стабільнасць у прыярытэце

БДУ стаў удзельнікам міжнароднага праекта COMPASS «Комплексное повышэнне патэнцыялу ва Усходнім суседстве і Цэнтральнай Азіі: інтэграцыя даследаванняў, эфектыўнае кіраванне і ўстойлівыя супольнасці». Гэта стала магчымым дзякуючы перамозе ў конкурсе Даследчага фонду па глабальных выкліках даследчых саветаў Злучанага Каралеўства. Са звыш 500 пададзеных заявак былі падтрыманы 37, у ліку якіх і БДУ.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця і канферэнцыі праекта 22 мая ў БДУ прынялі кіраўніцтва нашага ўніверсітэта, прадстаўнікі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, намеснік пасла Вялікабрытаніі ў Беларусі **Іан Фокс**, а таксама прадстаўнікі ўніверсітэтаў-партнёраў (Вялікабрытанія, Беларусь, Азербайджан, Узбекістан, Таджыкістан), супрацоўнікі наглядальнага савета COMPASS, дыпламатычных місій краін у Беларусі, Еўрапейскай камісіі, вядучыя даследчыкі Вялікабрытаніі, Германіі, Расіі і Беларусі. У гэты ж дзень былі абмеркаваны асноўныя напрамкі развіцця і супрацоўніцтва ў рамках COMPASS.

Удзельнікамі праекта з'яўляюцца Кенцкі ўніверсітэт (Вялікабрытанія), які выступае каардынатарам, Кембрыджскі ўніверсітэт (Вялікабрытанія), Азербайджанская дыпламатычная акадэмія (Азербайджан), Таджыкскі нацыянальны ўніверсітэт (Таджыкістан), Універсітэт сусветнай эканомікі і дыпламатыі (Узбекістан), агенцтва «Еўрафэкс» (Бельгія). Праект накіраваны на вывучэнне фарміравання ўстойлівых супольнасцяў, іх стабільнасці ў дачыненні да знешніх уздзеянняў. У рамках сумеснай дзейнасці ставіцца задача пашырэння ведаў пра рэгіён, а таксама падтрымка шэрагу ініцыятыў, такіх як, напрыклад, «Мінскі дыялог»; «Гендар і адукацыя ў Баку»; «Еўразійская ідэнтычнасць у Душанбэ»; «Шаўковы шлях» у Ташкенце»; «Парламенцкае супрацоўніцтва ў рэгіёне і Каспійская энергетычная бяспека ў Баку» і інш. У лік прыярытэтных задач уключана стварэнне рэгіянальных цэнтраў «перадавога досведу» ў вядучых ВНУ Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі, умацаванне навуковага партнёрства з універсітэтамі Вялікабрытаніі.

Рэалізацыя праекта разлічана да 2021 года.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце плануецца правядзенне даследаванняў і абмен досведам у галінах адукацыі, эфектыўнага кіравання ва ўмовах развіцця IT, міграцыйных працэсаў і рэгіянальнай бяспекі. Мяркуецца падрыхтоўка сумесных навуковых і навучальных публікацый, распрацоўка курсаў і праграм на англійскай мове з перспектывай стварэння сумесных магістарскіх праграм.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

02 чэрвеня Раманоўская Таццяна Уладзіміраўна, дацэнт кафедры генетыкі

07 чэрвеня Чупрыгін Алег Аляксандравіч, дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі

08 чэрвеня Угарына Таццяна Аляксандраўна, дацэнт кафедры тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі

09 чэрвеня Галуза Ала Уладзіміраўна, дацэнт кафедры псіхалогіі

10 чэрвеня Бярэйшык Лілія Уладзіміраўна, намеснік дэкана, гістарычны факультэт

10 чэрвеня Гронская Вольга Чаславаўна, дацэнт кафедры нямецкага мовазнаўства

19 чэрвеня Паляк Наталля Іпалітаўна, дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела

21 чэрвеня Голікава Жанна Анатольеўна, дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў

25 чэрвеня Драпеза Аляксандр Іванавіч, загадчык НДЛ біяаналітычных сістэм

28 чэрвеня Сіроцкі Анатоль Мікалаевіч, прафесар кафедры мытнай справы

АБ'ЯВЫ

НДІ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

СТАРШЫ НАВУКОВЫ СУПРАЦОЎНІК лабараторыі наназлектрамагнетызму.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226 42 31.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Міжуніверсітэцкі адукацыйны партал па крэатыўнай адукацыі створаны ў БДУ – marketing.by, kv.by, wuz.by (14.05), zviazda.by, БелТА, sputnik.by (15.05), pravo.by (16.05), «Звязда» (22.05).

Праект да Года малой радзімы для студэнтаў і выкладчыкаў стартаваў у БДУ – БелТА, wuz.by, belarus.by (03.05), zviazda.by (04.05).

Пра ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню Дня Перамогі ў БДУ – «Мінск-навіны», СТБ, БелТА, wuz.by, 21.by (03.05).

XIII міжнародны фэст студэнцкіх хароў «Папарацькветка» адбыўся ў БДУ – wuz.by (04.05), sb.by, БелТА (06.05), 1prof.by (07.05), «Мінск-навіны» (08.05), СТБ (11.05).

Студэнцкі праект «Вандровар» стартаваў у БДУ – wuz.by, sb.by (08.05), zviazda.by (09.05).

Пра агульнаўніверсітэцкую патрыятычна-асветніцкую акцыю «Вязынка–2018» БДУ – wuz.by, sb.by (16.05), zviazda.by (17.05), «Мінск-навіны» (18.05), АНТ (20.05).

Фінал II міжнароднага конкурсу стартап-праектаў BizTech BSU StartUp Contest прайшоў у БДУ – nastgaz.by (09.05), zviazda.by, «Мінск-навіны» (10.05), ecopress.by, wuz.by (17.05).

Пра вынікі прыёмнай кампаніі ў Ліцэй БДУ – sputnik.by (11.05), БелТА, belnovosti.by, sb.by (12.05), zviazda.by (15.05).

БДУ стаў удзельнікам міжнароднага праекта COMPASS – БелТА, «Мінск-навіны», sputnik.by, interfax.by, onliner.by, 21.by, belnovosti.by, zviazda.by, wuz.by (21.05), АНТ (22.05).

Круглы стол «Стратэгічнае партнёрства ў сферах медыявытворчасці і масавых камунікацый» адбыўся ў БДУ – sb.by, БелТА, 21.by, mogilevnews.by, belnovosti.by, sputnik.by (31.05).

Каманда ФМА БДУ прадставіць Еўропу на сусветным фінале міжнароднага конкурсу па касмічным праве імя Манфрэда Лахса – wuz.by, 21.by, gp.by (28.05), БелТА, slovodelu.by, zviazda.by (29.05).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

СТУДЭНЦКАЯ ПЛЯЦОЎКА

Штогадовы конкурс «Найлепшы моладзевы праект» праводзіцца ў БДУ з 2003/04 навуч. года дзеля выяўлення і падтрымкі арыгінальных студэнцкіх ініцыятыў, рэалізацыя якіх адкрые новыя магчымасці самаадукацыі і самаразвіцця для навучэнцаў універсітэта.
З кожным разам расце колькасць удзельнікаў, як і маштаб саміх праектаў. Некаторыя з іх становяцца традыцыйнымі і рэгулярна праводзяцца ў БДУ. Некаторыя, пасля ўдзелу ў конкурсе, падхопліваюцца факультэтамі і падраздзяленнямі і ў далейшым рэалізуюцца па-за конкурсам як самастойныя праекты.

Знайсці свой шлях

Кіраўнікі некалькіх цікавых моладзевых ініцыятыў распавялі пра змест сваіх праектаў

«СТЕНД»

Вольга САКАЛОЎСКАЯ, хімічны факультэт, 4 курс, старшыня аргкамітэта студэнцкага турніру прыродазнаўчых дысцыплін–2018

– Наш праект створаны для студэнтаў прыродазнаўчых спецыяльнасцяў. Яго мэтай з'яўляецца фарміраванне навуковага мыслення ва ўдзельнікаў, а таксама развіццё навыкаў рашэння нетрывіяльных фундаментальных навуковых і прыкладных вытворчых задач. Да ўдзелу прыцягваюцца студэнты розных універсітэтаў краін СНД і Еўропы. Напрыклад, сёлета ў турніры прынялі ўдзел студэнты з універсітэтаў Беларусі, Украіны, Расіі, Францыі і Германіі. Мы прапануем удзельнікам вырашаць задачы, актуальныя як для навуковай сусветнай супольнасці, так і для лакальных кампаній. Напрыклад, аднойчы кампанія, якая займаецца піваварствам, папрасіла нашых удзельнікаў прапанаваць тэхналагічны працэс для варэння новага гатунку піва. Нашы студэнты ўжо распрацоўвалі датчыкі для кантролю свежасці прадуктаў, вывучалі магчымасць спынення глабальнага пацяплення і прыдумвалі спосабы «зялёнай» ачысткі будынкаў ад графіці. Каманды рыхтуюць свае рашэнні ў выглядзе прэзентацый, і ў вочным этапе яны спаборнічаюць у фармаце навуковага бою: удзельнікі розных каманд дакладваюць свае рашэнні і выступаюць апанентамі іншых каманд. Так як усе рашэнні з'яўляюцца навукова абгрунтаванымі і часта пацверджаныя эксперыментамі, можна параўнаць турнір з абаронай навуковых прац. Усе навуковыя баі ацэньваюцца кампетэнтнымі сябрамі журы, якімі з'яўляюцца супрацоўнікі БДУ, Нацыянальнай акадэміі навук, выкладчыкі ВНУ іншых краін і прадстаўнікі спонсарскіх кампаній. Гульні доўжацца 4 дні, па выніках якіх вызначаюцца прызёры і пераможцы. Часцяком прадпрыемствы, якія прасілі нашых удзельнікаў вырашыць іх праблему, далей падтрымліваюць з імі зносіны, запрашаюць на працу, выдаюць гранты на далейшыя даследаванні ў гэтай сферы ці купляюць аўтарскія правы на іх ідэі.

– Чаму ваш праект патрэбны БДУ?

– Наш праект актуальны для БДУ, бо «СТЕНД» выступае пляцоўкай для ўзаемадзеяння студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ, НАН РБ і ВНУ іншых краін. Такое мерапрыемства – гэта своеасаблівая рэклама навуковых традыцый і ўзроўню адукацыі БДУ: з году ў год каманды студэнтаў нашага ўніверсітэта паказваюць высокі ўзровень падрыхтоўкі, і ўжо двойчы студэнты БДУ выйгравалі ў «СТЕНД». Зносіны з моладдзю, зацікаўленай у навуцы і выкарыстанні ведаў, атрыманых ва ўніверсітэце, у незвычайным фармаце, безумоўна, важныя для далейшага развіцця навукі ў Беларусі. Варта адзначыць, што турніры – папулярная практыка для студэнтаў у Расіі, Украіне і Еўропе, але ў Беларусі «СТЕНД» – адзінае мерапрыемства падобнага фармату.

– Як часта вы яго праводзіце?

– У 2018 годзе «СТЕНД» прайшоў ужо ў чацвёрты раз. Турнір праводзіцца раз у год, гэта ўжо традыцыйнае для БДУ мерапрыемства. Мы лічым, што часцей праводзіць турнір не варта, бо ў свеце турніраў ёсць своеасаблівы, ужо пастаянны, каляндар правядзення спаборніцтваў, а дасведчаныя гульцы, як правіла, бяруць удзел у некалькіх турнірах за год.

– Ці ёсць у вас планы па развіцці праекта?

– З кожным годам мы прыцягваем да ўдзелу ўсё больш каманд з Беларусі. На жаль, наш турнір папулярны больш сярод удзельнікаў з іншых краін, таму мы актыўна працуем у бок пашырэння ліку ўдзельнікаў з нашай краіны. Менавіта таму ў планах стварэнне турніру па хіміі для навучэнцаў старэйшых класаў. Мы хочам прыцягваць моладзь да навукі з юнага ўзросту, бо часцяком, вучачыся ў школе, людзі зусім не ўяўляюць, чым жа займаюцца ў навуковым свеце.

– Што вы можаце параіць студэнтам БДУ?

– Самае галоўнае і, мабыць, самае цяжкае – знайсці тое, чым сапраўды хочацца займацца. Таму хацелася б пажадаць студэнтам знайсці той шлях, па якім хочацца ісці, і ісці па ім, нягледзячы на ўсе цяжкасці. У нейкі момант вы азірняцеся назад, убачыце ўсё тое, што вы зрабілі, і зразумееце, што кожны выдаткаваны джоўль энергіі каштаваў таго. А калі вы вырашылі, што цярністы шлях у навуку – гэта ваша, то мы чакаем вас!

Сачыць за навінамі можна ў групе vk.com/stend_by.

FIRMUN



Дзмітрый БЯЛЬКО, факультэт міжнародных адносін, 2 курс

– Праект, які я прадстаўляю, называецца FIRMUN, ці «Мадэляванне ААН» на ФМА. Некалькі слоў пра канцэпцыю праекта. Мадэль ААН – гэта злучэнне канферэнцыі і ролевай гульні, дзе імітуецца праца гэтай арганізацыі. Кожны з удзельнікаў мадэлявання з'яўляецца дэлегатам ад якой-небудзь краіны свету і засядае ў адным з камітэтаў сістэмы ААН, які займаецца пэўнымі пытаннямі, няхай гэта будзе Савет Бяспекі ААН ці ЮНЕСКА. Галоўнай задачай для дэлегатаў з'яўляецца пошук кампрамісу паміж усімі краінамі-ўдзельнікамі перамоў і складанне выніковага дакумента – рэзалюцыі, якая змяшчае рашэнні, што задавальняюць усіх.

– Чаму ваш праект патрэбны БДУ?

– «Мадэляванне ААН» на ФМА БДУ ўжо стала візітнай карткай універсітэта. Як студэнцкі праект гэта ўнікальная ініцыятыва, якая праводзіцца на добраахвотніцкай і бясплатнай аснове. Актуальнасць праекта выяўляецца ў нарастанні значнасці ААН у міжнародных адносінах і таму папулярызацыі дзейнасці арганізацыі ў першую чаргу сярод моладзі.

Для БДУ значнасць правядзення «Мадэлявання» выяўляецца ў трох галоўных рэчах. Па-першае, гэта павышэнне прэстыжу ўніверсітэта за кошт рэалізацыі ўнікальнай сацыяльна-арыентаванай студэнцкай ініцыятывы. Па-другое, запатрабаванасць праекта вядзе да пашырэння маштабаў універсітэцкага супрацоўніцтва з ААН праз мадэляванне яе функцый. Па-трэцяе, праект сваёй мэтай ставіць развіццё навыкаў студэнтаў, што паспяхова робіць ужо на працягу 20 гадоў.

– Як часта вы яго праводзіце?

– Мы ладзім праект раз на семестр. Не думаю, што ёсць сэнс праводзіць яго часцей – хутка надакучыць, ды і арганізаваць яго не так і проста. Аднак і ісці на зніжэнне частаты мы не плануем.

– Ці збіраецеся развіваць праект?

– Вядома, у нас кожны год узнікае мноства планаў і ідэй. Так, мы праводзілі пасяджэнні на чатырох афіцыйных мовах ААН: рускай, англійскай, французскай і іспанскай. Аднак ёсць яшчэ дзве: арабская і кітайская – і мы ўпэўнены, што гэта ўсяго толькі пытанне часу, калі мы будзем весці пасяджэнні і на гэтых мовах.

Таксама мы імкнёмся павялічыць колькасць нашых удзельнікаў і, такім чынам, колькасць камітэтаў. Увосень у нас было каля 200 удзельнікаў з усіх абласцей і нават з суседніх краін. Але і гэта не мяжа!

– Што вы можаце параіць студэнтам БДУ?

– Думаю, самае важнае, што трэба не забываць усім студэнтам – гэта быць актыўнымі. Універсітэт праходзіць хутка, таму трэба атрымліваць асалоду ад яго па максімуме, як мага часцей браць удзел ва ўсіх мерапрыемствах і праектах. Гэта развівае не менш чым навучальны складнік!

«Дні прававога інфармавання БДУ»



Уладзіслаў ЛАЎРЫНОВІЧ, юрыдычны факультэт, 2 курс

– Наш праект мае на мэце адукацыю студэнтаў іншых факультэтаў у сферы прыкладной юрыспрудэнцыі ў рамках адпаведных профіляў, адначасова з гэтым выхаванне ў маладых людзей прававой маральнасці «дарослага жыцця».

– Чаму ваш праект патрэбны БДУ?

– У нашым універсітэце вучацца найлепшыя розумы сваіх пакаленняў, таму падрыхтоўка высакакласных спецыялістаў не можа лічыцца завершанай без юрыдычнай падкаванасці, менавіта гэты прабел і закліканы папоўніць наш праект.

Да таго ж БДУ – найбуйнейшая ВНУ нашай краіны, і, калі рэалізаваць такую прававую пляцоўку тут, значыць, падобны досвед можна будзе ўжываць паўсюдна.

– Як часта вы яго праводзіце?

– Наш праект з'яўляецца цыклічным з прычыны часовасці статусу студэнта: на змену выпускнікам прыходзяць першакурснікі, якія таксама маюць патрэбу ў прававой падтрымцы. Зыходзячы з дадзенага факта робім выснову, што праект не страчвае сваю актуальнасць з часам, што не абмяжоўвае колькасць мерапрыемстваў (у рамках

«Экастыль БДУ»

«Публіка і я»

«СТЕНД»

праекта) як унутры цыкла (года), так і на працягу навучання ў прынцыпе.

– Ці ёсць у вас планы па развіцці праекта?

– У будучыні мы лічым неабходным вялікую кастамізацыю праекта: магчымасць для студэнтаў розных факультэтаў самім аддалена выбіраць тэмы для абмеркаванняў, кола пытанняў, якія патрабуюць тлумачэння, што дапаможа і павялічыць мэтавую скіраванасць праекта, і падтрымліваць пастаянны прадметны дыялог са студэнтамі непасрэдна. Таксама ў распрацоўцы знаходзіцца ідэя стварэння на базе юрыдычнага факультэта спецыяльнай юрыдычнай кансультацыйнай службы для ўсіх студэнтаў БДУ.

– Што вы можаце параіць студэнтам БДУ?

– Для любога студэнта самае галоўнае – гэта ставіць МЭТУ! Адзінае, што сапраўды дапаможа студэнту дасягнуць усяго, што ён задумаў. Не баяцца марыць, не страчваць веры ў сябе, і тады ваша бачанне аднойчы стане рэальнасцю!

Сачыце за навінамі нашай групы ў адукацыйнай прасторы «УніверсітэтПЛЮС БДУ»

vk.com/proekt_bsu.

«Экастыль БДУ»

Аляксандра ЗАХАРАВА, хімічны факультэт, 2 курс

– Мэта нашага праекта – прышчапіць студэнтам і супрацоўнікам БДУ экалагічнае мысленне, а таксама стварыць зоны псіхалагічнай разгрузкі. Праект вельмі актуальны і патрабуе ўкладання немалых сіл для ўвасаблення.

– Чаму ваш праект патрэбны БДУ?

– Пры ажыццяўленні нашага праекта будзе павышана экакамфортнасць для студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў. БДУ дасягне больш высокага ўзроўню экалагічнасці. Таксама праект будзе падтрымліваць і рэалізоўваць ідэі канцэпцыі ўстойлівага развіцця – гэта супрацоўніцтва з кампаніямі і рэклама ў СМІ.

– Як часта вы яго праводзіце?

– На дадзены момант напісаны каляндарны план, у адпаведнасці з якім будуць праводзіцца лекцыі, трэнінгі, семінары на экалагічную тэматыку. Таксама вядзецца распрацоўка дызайну зон псіхалагічных разгрузак, наладжванне сувязяў з зацікаўленымі прадпрыемствамі, збор валанцёраў, лектараў, планаванне працы ў супрацоўніцтве са спецыялістамі ў галіне экалогіі.

– Ці мяркуеце развіваць праект?

– Планы ёсць, задуманым вынікам нашага праекта стане фарміраванне экалагічнай цікавасці сярод студэнтаў БДУ, інфармаванасць студэнтаў БДУ пра экалагічны стыль паводзін, а таксама распаўсюджанне досведу экалагізацыі адукацыйнага асяроддзя.

– Што параіце студэнтам БДУ?

– Фарміраванне экалагічнай свядомасці – неад'емная задача для кожнага чалавека, які імкнецца жыць у гармоніі з прыродай.

Сачыце за навінамі праекта ў групе: vk.com/ecostylebsu.

«Публіка і Я»

Кірыл ДЗЯШКЕВІЧ, механіка-матэматычны факультэт, 4 курс

– Асноўная мэта праекта «Публіка і Я» – навучыць прамоўніцкаму майстэрству. Фармат праекта не проста лекцыйны, асноўны ўпор ідзе якраз на практычныя заняткі, што значна эфектыўней. Удзельнікі праекта рыхтуюць хатнія заданні, на кожным занятку ўдзельнічаюць у трэнінгах, рыхтуюць прамову і ў фінале выступаюць з ёй. У адрозненне ад большасці іншых трэнінгаў, наш праект цалкам бясплатны, што таксама даволі прывабна для студэнтаў. Не кажучы ўжо пра тое, што ў выніку атрымліваецца навучыць чалавека выступаць перад публікай.

– Чаму ваш праект важны і патрэбны БДУ?

– Студэнты часта рыхтуюць выступленні як на парах, у рамках усяго ўніверсітэта, так і перад болей маштабнай аўдыторыяй. Таму праект, несумненна, патрэбны БДУ. Але прамоўніцкае мастацтва – гэта не толькі тое, як ты выступіш з гатовым дакладам. У паўсядзённым жыцці ўменне гаварыць – адно з найважнейшых для чалавека. Усё тое, чаму мы навучаем на праекце «Публіка і Я», спатрэбіцца не толькі людзям, якія часта ўдзельнічаюць у канферэнцыях, напрыклад, але і любому, хто хоча хораша, пісьменна і даходліва падаваць абсалютна любую інфармацыю. Мэта нашага ўніверсітэта – падрыхтаваць добрых спецыялістаў, але вельмі складана чагосьці дасягнуць, не ўмеючы выказваць свае думкі, баючыся публікі. Наш праект дапамагае зламаць сцяну паміж адным чалавекам і грамадствам.

– Як часта вы яго праводзіце?

– З гэтага года праект рэалізуецца два разы на год, у сувязі з павелічэннем колькасці ахвотнікаў удзельнічаць.

– Якія перспектывы ў праекта?

– Праект пашыраецца. Сёлета з удзельнікамі будзе працаваць зусім новы склад спікераў, кожны з якіх прынясе ў праект штосьці новае ад сябе. Таксама будзе абнаўляцца спіс тэм для выступленняў і пашырацца сама праграма трэнінгаў.

– Што вы можаце параіць студэнтам БДУ?

– Хачу параіць студэнтам БДУ выходзіць з зоны камфорту, спрабаваць новае, самаразвівацца і, вядома ж, паўдзельнічаць у нашым праекце.

Сачыце за навінамі ў групе: vk.com/audienceandme.

«Зялёны ўніверсітэт»

Алеся СМЯХОВІЧ, факультэт міжнародных адносін, 3 курс

– «Зялёны ўніверсітэт» – гэта экалагічная ініцыятыва студэнтаў і студэнтак БДУ. Наша мэта – універсітэт, у якім прасунутая, экалагічна пісьменная моладзь паасобна збірае смецце, эканоміць ваду, электрычнасць, імкнецца да нулявых адходаў і цікавіцца, як зрабіць сваё жыццё больш экалагічна сяброўскім. Для гэтага мы працуем у двух напрамках: арганізацыя паасобнага збору адходаў ва ўніверсітэце і студэнцкіх інтэрнатах і фарміраванне экалагічнай культуры ў студэнцкім асяроддзі.

Мы праводзім мерапрыемствы, якія даюць магчымасць студэнтам даведацца пра стан навакольнага асяроддзя, пра экалагічныя праблемы і, галоўнае, пра тое, што можа зрабіць кожны з нас, каб дапамагчы іх рашэнню ці хоць бы не спрыяць іх паглыбленню.

Разам з «Зялёным універсітэтам» вы можаце глядзець фільмы, сустракацца з экспертамі, вучыцца працаваць сваімі рукамі, паасобна збіраць смецце і чысціць ад яго прыродныя тэрыторыі, гуляць у экалагічныя гульні, удзельнічаць у дэбатах, круглых сталах і форум-тэатры, наведваць экасцежкі і шматлікае іншае.

– Чаму ваш праект патрэбны БДУ?

– Па-першае, студэнты – гэта велізарны патэнцыял. Яны будучыя супрацоўнікі і прадпрымальнікі, таму важна фарміраваць у іх пісьменнае і клапатлівае стаўленне да навакольнага свету.

Па-другое, экалагічныя ініцыятывы ў ВНУ стымулююць экалагічнае развіццё гарадоў і краіны ў цэлым.

Па-трэцяе, экалагізацыя ўніверсітэтаў – гэта міжнародны трэнд, і мы хочам, каб БДУ яму адпавядаў. Гэта ўплывае ў тым ліку на прэстыж ВНУ.

Праект важны не толькі для БДУ, але і для краіны, для свету, для кожнага з нас! Ад нашага стаўлення да навакольнага свету цяпер наўпрост залежыць якасць нашага жыцця і цяпер, і ў будучыні.

– Як часта вы яго праводзіце?

– У сярэднім, адно мерапрыемства на два-тры тыдні. Часцей не трэба. Для нас важная якасць узаемадзеяння з удзельнікамі

– Ці плануеце развіваць праект?

– Планы вялікія, як і сам праект. Цяпер у нашай камандзе ёсць прадстаўнікі 5 факультэтаў БДУ (міжнародных адносін, гістарычны, філалагічны, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій і МДЭІ імя А. Д. Сахарава). Мы плануем, што да нас далучацца прадстаўнікі астатніх факультэтаў, а ў будучыні імкнёмся стаць адзінай платформай БДУ, якая аб'ядноўвала б студэнцкія экалагічныя ініцыятывы.

– Што вы можаце параіць студэнтам БДУ?

– Змены магчымыя, і яны пачынаюцца з кожнага з нас. Некаторыя лічаць, што ад дзеянняў аднаго чалавека мала што можа змяніцца. Аднак калі кожны прысвеціць трохі свайго часу экалогіі, то вынік будзе заўважны. Не трэба чакаць, калі іншыя пачнуць штосьці рабіць. Усё пачынаецца з нас самі. Кропля за кропляй – і акіян.

Далучайцеся да праекта «Зялёны ўніверсітэт» і сачыце за навінамі ў нашай групе

vk.com/g_university.

«Бітва дызайнераў»



Валерыя КАЗЛОВА, біялагічны факультэт, 4 курс

– «Бітва дызайнераў» – праект для студэнтаў БДУ і яго падраздзяленняў. Асноўная мэта праекта – стварэнне творчай пляцоўкі для маладых дызайнераў. Ва ўніверсітэце, на мой погляд, ужо дастаткова праектаў для вакалістаў, танцораў, вядучых, тэатралаў і г. д.

Дызайнеры – гэта людзі, ад якіх залежыць першасная рэакцыя на любое мерапрыемства. Пра іх не варта забываць, а то аднойчы яны змовяцца і зладзяць вайну вышэйзгаданым напрамкам. Сёлета ў «бітвы» быў «выпрабавальны забег»: на працягу 2,5 тыдняў мы збіралі дызайнераў і прапанавалі ім розныя заданні як ад арганізатараў, так і ад брэндынгавай кампаніі. У праекце бралі ўдзел не толькі студэнты спецыяльнасці «дызайн», што мяне, як арганізатара, прыемна парадавала. Апроч конкурснай часткі ў праекта ёсць адукацыйная частка: майстар-класы для ўсіх ахвотнікаў.

– Чаму ваш праект патрэбны БДУ?

– На выхадзе мы стварылі базу дызайнераў БДУ, доступ да якой у хуткім часе атрымаюць усе ахвотнікі. Пасля праекта мы працягваем дапамагаць дзецям з пошукам працы, каб яны «набівалі руку» і вучыліся працаваць з патэнцыйнымі заказчыкамі. Чым дрэнна, калі наш універсітэт будзе слаўны не толькі добрымі вакалістамі, але і, напрыклад, дызайнерамі?

– Як часта вы яго праводзіце?

– Праект стартаваў у канцы 2017 года. Я лічу, што раз на год хопіць. На працягу года будуць ладзіцца майстар-класы для дзяцей, таму праца з праектам будзе весціся ўвесь год. Гэта новаўвядзенне ў праекце. На працягу конкурсных тыдняў колькасць майстар-класаў будзе большай.

– Якім бачыце праект надалей?

– Веру, што «Бітва дызайнераў» будзе запатрабавана ў БДУ, адкрые шмат таленавітых дзяцей, якія будуць працаваць на карысць сабе і нашай альма-матар. Нам ёсць куды імкнуцца! Прыемна, што пасля праекта водгукі пра яго былі не толькі ад студэнтаў БДУ. Таму мы падумваем, а ці не зрабіць нам міжуніверсітэцкую бітву дызайнераў?

– Што вы можаце параіць студэнтам БДУ?

– Не бойцеся брацца за самыя вар'яцкія (на ваш погляд) ідэі і праекты! Усё рэальна! Ва ўніверсітэце вас заўсёды пачуюць і дапамогуць!

Стварайце і не дазваляйце творчасці сысці з вашага жыцця!

Сачыце за навінамі праекта «Бітва дызайнераў» у групе

vk.com/designerbsu.

Падрыхтаваў
Уладзімір МЕШЧАРАКОЎ

АСОБЫ

Гісторыю часта называюць палітыкай, звернутай назад

Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя **Анатолій ТОЗІК** – прыкметная асоба для БДУ. Ён доўгі час займаў высокія дзяржаўныя пасады, быў паслом нашай краіны ў Кітаі. Між тым за яго плячыма вучоба ў БДУ і цікавае камсамольскае мінулае. Мы папрасілі яго падзяліцца сваімі разважаннямі пра рэчаіснасць, вынікамі жыццёвага і прафесійнага вопыту.

У адным з вугальных кар'ераў Кітая з гендырэктарам БелАЗа Паўлам Марыевым разам з кітайскімі партнёрамі

– Анатолій Афанасьевіч, адкуль Вы родам, ці часта наведваеце малую радзіму?

– Нарадзіўся я ў маленькай вёсцы ў Палескай вобласці (была такая ў Беларусі да 1954 года з цэнтрам у Мазыры). Калі мне было тры гады, сям'я пераехала ў Жлобінскі раён (бацька працаваў на чыгунцы), жылі ў дамку, які належаў чыгунцы, зробленым у паваенныя гады са старых шпал. Там жа скончыў Мармальскую сярэднюю школу і ў 17 гадоў з'ехаў вучыцца ў наш БДУ. З тых часоў жыву ў Мінску, за выключэннем пяці «кітайскіх» гадоў. Сёння няма ўжо ні той маленькай хаткі, куды мяне прывезлі з радзільні, ні нашага дамка ля чыгункі. Але ўсё ж штосьці там засталося, таму хоць бы раз у год стараюся падыхаць тым паветрам і пастаяць ля магіл дарагіх для мяне людзей.

– Вы кандыдат гістарычных навук, прафесар. Што паўплывала на выбар спецыяльнасці ў юныя гады? Чаму гісторыя?

– Не ведаю, напэўна, Лёс. З дзяцінства падабалася ўдзельнічаць у грамадскай працы, быў старшынёй савета піянерскай дружыны, сакратаром камсамольскай арганізацыі школы. Хутчэй за ўсё, гэта акалічнасць вызначыла мой жыццёвы шлях. Хоць дагэтуль здзіўляюся свайму адчайнаму ўчынку ў 1966 годзе: з сельскай школы адважыцца ехаць паступаць у галоўны (і тады адзіны) універсітэт краіны, ды яшчэ і ва ўмовах двайнога выпуску – у той год выпускаліся адзінаццаты і дзясяты класы. Праўда, такіх адчайных было некалькі, у тым ліку яшчэ адзін паляшук Пётр Брыгадзін, які стаў доктарам навук, прафесарам, міністрам адукацыі і цяпер служыць альма-матар.

Я пра гэта кажу яшчэ і вось чаму: і ў тыя гады, і цяпер не важна, у якой ты школе вучышся – у сталіцы, у раённым цэнтры, у палескай вёсцы – да сваёй мэты можна прыйсці з любой школы (і нават без рэпетытараў).

Што тычыцца Гісторыі (менавіта з вялікай літары) як навукі... У 90-я гады ўжо мінулага стагоддзя мне давялося быць у ліку распрацоўшчыкаў праекта першай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і непасрэдна адказваць за яго гуманітарны кампанент. Доўгія гады дзяржаўнай службы яшчэ больш пераканалі мяне ў тым, што Гісторыя з'яўляецца і павінна быць адным з асноўных фактараў выхавання грамадзяніна і патрыёта. Гісторыю часта называюць палітыкай, звернутай назад. І ў нейкай ступені гэта правільна. Любая краіна павінна выкарыстоўваць айчынную гісторыю, гістарычную адукацыю для кансалідацыі народа, умацавання дзяржавы, рашэння стратэгічных нацыянальных задач. Вось чаму гістарычная памяць павінна быць неад'емным кампанентам нацыянальнай свядомасці і адным з індыкатараў узроўню культуры і адукаванасці нацыянальнай эліты.

І хай не крыўдзяцца на мяне мае калегі-гісторыкі, але ў рашэнні гэтай найважнейшай задачы мы з'яўляемся дрэннымі памочнікамі нашай Беларусі. За чвэрць стагоддзя суверэннага развіцця мы нават не здолелі сфарміраваць навуковую, годную нашай краіны канцэпцыю нацыянальнай гісторыі.

У наш час актыўна абмяркоўваецца змест т. зв. «сацгумблока» ў праграме ўніверсітэцкай адукацыі. Лічу, было б вельмі правільным ва ўсіх ВНУ краіны ўвесці курс «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», што было б больш актуальным, чым прапанаваны курс «Асновы беларускай дзяржаўнасці».

– Якім Вы памятаеце гістарычны факультэт БДУ ў часы свайго студэнцтва? Якімі раней былі студэнты?

– Думаю, наш гістфак не дужа адрозніваўся ад гістфака сённяшняга. Але два адрозненні хацеў бы адзначыць. Па-першае, сярод нашых выкладчыкаў было шмат франтавікоў, і адзін з іх – наш любімы дэкан Пётр Захаравіч Савачкін. Нас вучылі франтавікі. Іх атачала асаблівая аўра, і гэта, лічу, аказвала адмысловае ўздзеянне на студэнтаў. І па-другое, тады гістфак знаходзіўся на пятым і шостым паверхах галоўнага корпуса БДУ, вокны нашай 609-й паточнай аўдыторыі выходзілі на плошчу Леніна (цяпер плошча Незалежнасці). Дагэтуль памятаю аўдыторыю, у якой здаваў уступны іспыт па гісторыі. Таму для мяне і маіх аднакурснікаў роднымі з'яўляюцца гэтыя паверхі і аўдыторыі, дзе прайшлі пяць гадоў нашай юнацкасці і маладосці.

Якімі былі студэнты? Дзецьмі свайго часу. Як і студэнты цяперашнія. Наша галоўнае адрозненне – у нас не было смартфонаў. І камунікавалі мы адзін з адным, а не са смартфонам ці праз смартфон. Добра гэта ці дрэнна – пакажа час. Але лічу, зносіны чалавека з чалавекам у чалавечым грамадстве, калі яно хоча застацца такім, павінны быць прыярытэтнымі.

– У 1975 годзе Вы ўзначалілі камсамол БДУ. Ці лёгка было сумяшчаць выкладанне і кіраўніцтва камітэтам камсамола?

– Ды не, нескладана. Да таго часу я ўжо абараніў кандыдацкую дысертацыю (маім навуковым кіраўніком быў рэктар БДУ прафесар Усевалад Міхайлавіч Сікорскі) і выкладчыкам працаваў па сумяшчальніцтве, на 0,5 стаўкі. Сіл тады было шмат, ды і працаваць у камсамоле было вельмі цікава. Многія з тых, хто прайшоў школу камсамола, сталі буйнымі кіраўнікамі, вядомымі навукоўцамі, арганізатарамі бізнесу.

Мяне абіралі сакратаром камітэта камсамола ўвосень 1975-га і ўвосень 1977-га. Напачатку 1979-га я здаў гэту пасаду Пятру Брыгадзіну. Камсамол даў мне вельмі многае для будучай прафесійнай дзейнасці. Камітэт камсамола БДУ меў правы райкама, у нас было больш за дзесяць штатных работнікаў. Колькасць усёй арганізацыі на 1 студзеня 1976 года, запомніў, складала 10 614 чалавек.

Мы былі досыць самастойнымі ў рашэнні шматлікіх пытанняў, галоўным чынам у арганізацыі летняга працоўнага семестра. Штогод на будоўлі Беларусі, Расіі, Казахстана, у замежныя краіны ў складзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў БДУ выязджалі ад дзвюх да трох тысяч студэнтаў. І цяпер ганаруся тым, што за тры летнія семестры ў нас не было ніводнай смерці. Упершыню ў БДУ ў тыя гады пачалі фарміравацца зімовыя студэнцкія будаўнічыя атрады (на перыяд зімовых вакацый, іх удзельнікі трохі раней здавалі сесію), а таксама летнія камуністычныя будатрады (цяпер бы іх называлі добраахвотніцкімі).

– Які партрэт лідара быў у Ваш час, і як выхаваць лідара цяпер?

– Не думаю, што асноўныя характарыстыкі лідара змяняюцца з часам. Перакананы, лідара выхаваць нельга. Выхаваць можна кіраўніка. Лідарам жа трэба нарадзіцца, а затым апынуцца ў патрэбным месцы і ў патрэбны час. Лідар павінен шчыра верыць у патрэбнасць таго, што робіць, і адчуваць, што хочуць тыя, чыім лідарам ён з'яўляецца. Але не ісці за імі, а весці іх за сабой. Гэта ў самых агульных рысах.

– Ваша сфера навуковых інтарэсаў звязана з партызанскай і падпольнай барацьбой на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гадах. Што Вы памятаеце пра стварэнне мемарыяльнага знака ў памяць студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, загінулых у гады вайны?

– Так, у савецкі час я шмат гадоў займаўся гэтай тэмай. Вядома, з пазіцый назапашанага за дзесяцігоддзі жыццёвага і прафесійнага вопыту разумееш, што вайна – гэта не толькі (і не столькі) перамогі і подзвігі. Гэта перш за ўсё велізарнае чалавечае гора. Усё было нашмат больш складаным і трагічным. Разам з тым гэта не толькі не памяншае, а павінна ўзмацняць нашу павагу да тых, хто прайшоў праз усё гэта і зрабіў усё, што змог, каб пакінуць нашчадкам Вялікі Дзень Перамогі.

Разам з тым як гісторык хачу сказаць, што, захоўваючы ў гістарычнай памяці Вялікую Айчынную вайну, мы павінны вяртаць з забыцця і шматлікія іншыя войны, у якіх нашы продкі таксама мужна абаранялі сваю зямлю. Веру, што з часам і наш Музей Вялікай Айчыннай вайны па сваім змесце стане Музеем беларускай вайсковай славы.

Пра мемарыяльны знак. На жаль, у памяці сцерліся пэўныя даты і факты. Памятаю, што пабудаваны ён быў на сродкі, сабраныя і зароблены выкладчыкамі і студэнтамі ўніверсітэта (я тады ўжо выкладаў і быў сакратаром камітэта камсамола гістфака). Урачыстае адкрыццё адбылося ў маі 1975-га, у год 30-годдзя Перамогі.

– Якія традыцыі існуюць у Вашай сям'і падчас святкавання Дня Перамогі?

– Думаю, такія ж, як і ў іншых сем'ях, па лёсах якіх прайшоўся цяжкі каток вайны. Бацька вярнуўся з фронту з цяжкім раненнем, але жывы. Маці зусім юнай дзяўчынай перажыла акупацыю. Некалькі сваякоў назаўжды засталіся ў Азарыцкім канцлагеры смерці. Таму свята гэта, як спяваецца ў песні, «са слязамі на вачах», свята, у якім змяшаны шматлікія пачуцці – гонар, радасць, скруха і шматлікае іншае.

– У 2006–2011 гадах Вы былі паслом Беларусі ў Кітаі. Ці лёгка было Вам знайсці агульную мову з кітайцамі? Наколькі важнае для Беларусі супрацоўніцтва з Кітаем?

– Я заўсёды буду ўдзячны Лёсу і Прэзідэнту нашай краіны за тое, што ў маім жыцці былі гэтыя выдатныя пяць гадоў. Лічу, што яны былі самыя цікавыя і плённыя ў маёй прафесійнай дзейнасці. І ляцеў я ў Пекін з ужо пэўнымі ведамі і практычнай падрыхтоўкай. Упершыню Кітай увайшоў у маю свядомасць яшчэ ў студэнцкія гады. Тады былі не найлепшыя часы ў савецка-кітайскіх адносінах. Але, на шчасце, мае гістфакаўскія настаўнікі змаглі сфарміраваць у мяне глыбокую пашану да кітайскага народа і яго 5000-гадовай гісторыі і культуры. Да таго ж, недзе на працягу года да прызначэння паслом я быў супастаршынёй Міжурадавай беларуска-кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і меў некаторы вопыт зносін з прадстаўнікамі дзяржаўных органаў і дзелавых колаў Кітая.

Адчуваў сябе ў Кітаі камфортна, з кітайцамі адразу пачалі складацца добрыя дзелавыя адносіны. Можа, калі верыць будызму, у адным з мінулых жыццяў я быў кітайцам? Не ведаю. Важна іншае: у гэтыя гады для Беларусі былі адкрыты шматмільярдныя крэдытныя лініі, рэалізаваны буйныя і патрэбныя нашай эканоміцы інвестыцыйныя праекты, у Беларусі і ў Кітаі пачалі стварацца сумесныя прадпрыемствы. Спадзяюся, што гэта з'явілася і вынікам працы пасла і калектыву пасольства.

Важнасць для Беларусі супрацоўніцтва з Кітаем пераацаніць складана. Кітайская Народная Рэспубліка паслядоўна і дынамічна рухаецца да статусу глабальнага лідара, становіцца дзяржавай, якая будзе аказваць вырашальны ўплыў на светабудову ў XXI ст. Кітай валодае велізарным інвестыцыйным, тэхнічным і тэхналагічным патэнцыялам, які ён гатовы выкарыстоўваць у рэалізацыі сумесных узаемавыгадных праектаў. Кітай для нас важны і як палітычны партнёр, з дапамогай якога фарміруецца сістэма стрымак і процівагаў, неабходная для забеспячэння нацыянальных інтарэсаў краіны.

Сёлета Кітай адзначае 40-годдзе палітыкі рэформаў і адкрытасці, фенаменальныя вынікі якой відавочныя. Гэты кітайскі вопыт, перакананы, надзвычай важны для нашай краіны, для сістэмных пераўтварэнняў у нашай эканоміцы. З гэтага вынікае неабходнасць глыбокага вывучэння Кітая, патэнцыялу беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Нам трэба стварыць айчынную школу кітаязнаўства. Спадзяюся, што ў якасці дырэктара РІКК я змагу паспрыяць рашэнню гэтай задачы.

– Што для Вас БДУ?

– Цяжка знайсці кароткі адказ на гэта пытанне. Цяпер шмат кажуць пра малую радзіму. Напэўна, БДУ і ёсць мая малая радзіма. Я бязмерна ўдзячны тагачаснаму кіраўніцтву ўніверсітэта за тое, што пасля завяршэння маёй дзяржаўнай службы прынялі мяне на гэтай радзіме, служэнню якой я хацеў бы прысвяціць сябе, пакуль яна будзе лічыць патрэбным.

Гутарылі
Рыгор ПАСРЭДНІК,
Кацярына ШАЙКО

BizTech–2018: навучанне праз практычны досвед

Другі міжнародны конкурс стартап-праектаў, віртуальны хакатон і канферэнцыя прайшлі з 20 красавіка па 20 мая пад лагатыпам BizTech–2018.

Мерапрыемства стала пляцоўкай для знаёмства патэнцыйных стартап-праектаў з прадстаўнікамі бізнес-супольнасці, банкаўскага сектара і прафесарска-выкладчыцкага складу. Цэлы месяц удзельнікі форуму вучыліся ў майстроў сваёй справы ў сферы бізнесу і IT-тэхналогій, а таксама «пітчылі» свае ідэі. Падрабязнасці распавёў арганізатар **Дзмітрый МАРУШКА,** загадчык кафедры эканамічнай інфарматыкі БДУ.

Падчас фіналу конкурсу BizTech–2018 у Парку высокіх тэхналогій

Прэзентацыя праекта NeoBust

Дзмітрый Марушка ўручае дыплом пераможцу ў намінацыі «Сімпатыя спонсара»

Месяц насычанай праграмы

Пляцоўка стваралася кафедрай эканамічнай інфарматыкі эканамічнага факультэта БДУ сумесна з Паркам высокіх тэхналогій. Дапамогу з правядзеннем мерапрыемства аказвалі валанцёры – студэнты БДУ. Мерапрыемства праходзіла маштабна і насіла практыка-арыентаваны характар. На працягу месяца былі праведзены віртуальны хакатон, конкурс стартап-праектаў і канферэнцыя са знакамітымі спікерамі.

– Перад BizTech ставіліся ў першую чаргу адукацыйныя мэты, – кажа Дзмітрый Марушка. – Мы планавалі правесці мерапрыемства, якое адпавядала б самым высокім міжнародным патрабаванням, бо хочам зрабіць нашу адукацыю ў галіне прадпрымальніцтва і інфармацыйных тэхналогій адной з найлепшых у свеце. У рамках тых задач, якія мы запланавалі, думаю, змаглі рэалізаваць усё задуманае. Была яшчэ адна важная задача – прадэманстраваць, што наш універсітэт з'яўляецца сучаснай і перадавой установай адукацыі.

У конкурсе ўдзельнічалі школьнікі, студэнты, маладыя навукоўцы і прадпрымальнікі, якія маюць праекты на розных стадыях развіцця. На конкурс было пададзена 96 заявак. Так, BizTech пачаўся з віртуальнага хакатону, які працягнуўся з 20 красавіка па 10 мая і дапамог камандам-канкурсантам у рэжыме анлайн падрыхтавацца да ўдзелу ў адборачным туры пад кіраўніцтвам прафесійных ментараў.

– У рамках віртуальнага хакатону студэнты ўзаемадзейнічалі з ментарамі, у якасці якіх выступілі прадстаўнікі бізнес-супольнасці, спецыялісты вядучых беларускіх IT-кампаній, банкаўскіх арганізацый і ўніверсітэтаў. Больш за 40 прафесіяналаў сталі ментарамі камандаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, – дапаўняе загадчык кафедры.

Ментары дэталёва аналізавалі праекты, падказвалі і курыравалі працу стартаперaў, дапамагалі выбіраць правільныя арыенціры для камерцыялізацыі ідэй. Іх задача заключалася ў тым, каб з боку бізнесу ацаніць, наколькі прадстаўленыя стартап-праекты могуць быць паспяховымі на рынку, а прапанаваныя прыкладанні і сэрвісы запатрабаванымі сярод спажыўцоў.

– На адборачны тур былі запрошаны 46 каманд. У адборы змаглі прыняць удзел толькі тыя каманды, якія выканалі заданні ментараў – падрыхтавалі дэталізаванае апісанне свайго прадукту ў адпаведнасці з мадэллю Lean Canvas, запісалі відэапрэзентацыю і ўсе матэрыялы праекта размясцілі на платформе віртуальнага хакатону. Усё гэта ўлічвалася ментарамі пры прыняцці рашэння, якая каманда патрапіць на адборачны тур. Гэта было вельмі няпростае рашэнне! – распавядае Дзмітрый Аляксандравіч.

Сам адборачны тур прайшоў 11 мая, ён складаўся з публічнай абароны праектаў і далейшага адбору каманд у фінал. Больш за чвэрць усіх стартапаў былі прадстаўлены студэнтамі БДУ, астатнімі ўдзельнікамі выступілі студэнты іншых ВНУ, індывідуальныя прадпрымальнікі і камерцыйныя кампаніі, школы, гімназіі, ліцэі. На фінал змаглі патрапіць 32 каманды.

– На мой погляд, BizTech – сучасная форма арганізацыі навучальнага працэсу, – дзеліцца Дзмітрый Аляксандравіч. – Прадстаўнікі бізнес-супольнасці дапамагаюць зрабіць навучанне больш практыка-арыентаваным за кошт таго, што пад іх непасрэдным кіраўніцтвам студэнты і школьнікі атрымліваюць практычныя навыкі працы над сваімі ўласнымі праектамі. Акрамя таго, наша мерапрыемства дае студэнтам магчымасці для пошуку месцаў практыкі і стажыровак, а таксама працаўладкавання, бо бізнес-кампаніі вельмі зацікаўлены ў таленавітых спецыялістах.

Узмоцнены інтэнсіў

Канферэнцыя і акселерацыйная праграма прайшлі з 24 па 27 красавіка. Умоўна яны дзяліліся на такія дні: дзень моладзевага прадпрымальніцтва, дзень прадуктовай ідэі і стратэгіі, дзень фандрэйзінгу, дзень маркетынгу і продажаў. Па выніках працы канферэнцыі плануецца выданне зборніка тэзісаў дакладаў.

З дакладамі і майстар-класамі выступілі больш за 50 вядомых беларускіх і замежных прадпрымальнікаў, банкіраў, навукоўцаў, палітыкаў і выкладчыкаў універсітэтаў. Яны разглядалі актуальныя напрамкі развіцця стартап-руху, дзяліліся сваім досведам стварэння бізнесу, распавядалі пра тое, як яго прасоўвалі і як «заваёўвалі» карыстальніцкую аўдыторыю, каментавалі зробленыя імі першыя памылкі. Шмат чаго было сказана пра пабудову стратэгіі маркетынгу, фарміраванне і павышэнне лаяльнасці кліентаў брэнда, а таксама пра прыцягненне фінансавання для стартапаў з улікам асаблівасцяў функцыянавання беларускай інавацыйнай экасістэмы. Спонсары і прадстаўнікі банкаўскіх устаноў распавялі пра тое, як адбываецца экспертыза стартап-праектаў, юрысты, у сваю чаргу, прадставілі агляд заканадаўства, якое рэгулюе дзейнасць IT-бізнесу, і падказалі пачаткоўцам стартаперам, на што неабходна зважаць пры стварэнні кампаніі. Адмысловая ўвага была нададзена перспектывам навучання прадпрымальніцтву, былі закрануты «гарачыя» тэмы – прадпрымальніцтва ў эру блокчэйну, напрамкі развіцця IT-бізнесу ў рамках «Дэкрэта аб ПВТ 2.0», механізмы фарміравання лічбавай эканомікі і шматлікія іншыя.

Фінальны акорд

Верагодна, самы хвалюючы дзень – фінал конкурсу стартап-праектаў, які прайшоў 18 мая. У гэты дзень каманды прэзентавалі праекты ўдзельнікам журы, якое складалася з прадстаўнікоў бізнес-супольнасці, банкаўскіх устаноў і прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ.

У намінацыі «Адукацыйны стартап» перамога была за праектам Scrawlless, прадстаўленым студэнтамі БДУІР. Як яны самі распавялі, запушчаны інтэрнэт-партал scrawlless.me дазваляе дзецям з парушэннямі дробнай маторыкі выконваць школьныя заданні і адпраўляць іх свайму настаўніку.

Праект SoX быў прызнаны найлепшым у намінацыі «Сацыяльна-значны стартап» (**Ірына Емяльянава** і **Канстанцін Кулак** – ФПМІ, **Іван Зайкоў** – мехмат). Распрацаванае студэнтамі мабільнае прыкладанне дапамагае падабраць найбольш зручную пару абутку.

У намінацыі «Глабальны стартап» найлепшым стаў праект UAVext (**Іван Саечнікаў** – РФКТ, **Арнольд Штэрэнхарц** – Берлінскі тэхнічны ўніверсітэт, **Міхаіл Антоненка** – кампанія «Сінезіс»). Мэта праекта заключаецца ў распрацоўцы модуляў пашырэння рознага функцыяналу, якія будуць сумяшчальныя з апаратнымі і праграмнымі кампанентамі мультыротарных дронаў і прызначаны для кантролю хаатычнага беспілотнага руху ў паветранай прасторы.

У намінацыі «BizTech Юніёр» перамогу атрымаў праект NeoBust, распрацаваны школьнікамі з гімназіі № 24 г. Мінска, які ўяўляе сабой глабальны агрэгатар, што дазваляе аб'яднаць усе буст-сэрвісы па прасоўванні гульнявых прыкладанняў у сацыяльных сетках.

Акрамя гэтага, шэраг каманд быў адзначаны ў намінацыі «Сімпатыя фундатара». Сярод прадстаўнікоў БДУ гэта дзве каманды. Першы стартап-праект арыентаваны на стварэнне крыптавалютнага інвестыцыйнага фонду VAA and Company (**Уладзіслаў Сташэўскі** – эканамфак, **Аляксей Лук'янін** – БДЭУ), другі – Hexfarm (**Ілья Грыгор'еў** – ФРКТ, **Ксенія Бяляўцава** і **Дар'я Наркевіч** – біяфак), арыентаваны на стварэнне фермерскіх гаспадарак у гарадскіх умовах у фармаце вертыкальных модульна-аўтаномных інкубатараў, дзе плануецца вырошчваць сельскагаспадарчую прадукцыю (т. зв. «фермы ў гарадах»).

Пераможцы конкурсу атрымалі каштоўныя падарункі ад спонсараў, новыя веды і досвед, а таксама кантакты ментараў, спікераў і інвестараў, гатовых дапамагчы далейшаму развіццю іх стартап-праектаў.

– Мы стварылі міжнародную стартап-пляцоўку, правялі канферэнцыю, віртуальны хакатон і конкурс, тым самым далі камандам магчымасць сустрэцца і пачаць супрацоўніцтва з прадстаўнікамі бізнес-супольнасці. Далейшыя перспектывы развіцця праектаў зараз залежаць толькі ад канкурсантаў, – кажа загадчык кафедры.

Акрамя гэтага Дзмітрый Марушка раіць студэнтам, якія маюць цікавыя бізнес-ідэі, браць удзел у такіх мерапрыемствах, як BizTech. Не варта трымаць сваю ідэю ў вакууме і хаваць яе ад грамадскасці, неабходна камунікаваць і кансультавацца з прадстаўнікамі бізнесу, а таксама актыўна анансаваць інфармацыю пра свой праект у СМІ і сацыяльных сетках, не баючыся таго, што яе могуць скапіяваць. Размешчаныя анонсы і публікацыі дазволяць забяспечыць прынамсі абарону аўтарскіх правоў на свой прадукт.

Наступны сезон BizTech арганізатары плануюць правесці яшчэ больш маштабна.

– Мы накіраваны на прыцягненне большай колькасці таленавітых студэнтаў, школьнікаў, маладых навукоўцаў і прадпрымальнікаў. Школьнікі ў перспектыве могуць стаць абітурыентамі нашага ўніверсітэта, студэнты знойдуць перспектыўныя працоўныя месцы ў высокатэхналагічных кампаніях, а маладыя навукоўцы і прадпрымальнікі змогуць паспяхова камерцыялізаваць свае распрацоўкі. Мы спадзяёмся на тое, што BizTech будзе і далей спрыяць выяўленню таленавітай моладзі, якая зможа рэалізаваць творчы патэнцыял і будзе ўдзельнічаць у будаўніцтве IT-краіны, – адзначыў Дзмітрый Аляксандравіч.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

У ВОЛЬНЫ ЧАС

Кемлівасць, спрыт і джамп-стайл на турзлёце БДУ

У маляўнічым месцы, на малой радзіме Якуба Коласа, у дзясяты раз прайшоў студэнцкі турыстычны злёт «Высокі бераг». 15 каманд правялі тры насычаныя дні пад Стоўбцамі.

На турзлёце былі каманды не толькі ад факультэтаў, але і арганізацый БДУ: творчая студыя «МіМ-БДУ», савет студгарадка падужаліся за званне найлепшай каманды. Студэнты змагаліся не толькі ў спорце, але і ў творчасці. Конкурс візітовак, песні ля вогнішча, творчы нумар і агляд лагераў паказалі, якія таленавітыя і крэатыўныя хлопцы і дзяўчаты вучацца ў нашым універсітэце.

Тэма гэтага года – «Дзяржаўныя органы». Каманды на некалькі дзён сталі міністэрствамі адукацыі, сельскай гаспадаркі, інфармацыі і г. д. Яны распрацавалі свае інфармацыйны плакат, відэа пра гадавую справаздачу, афармленне лагера і карпаратыўны стыль. Апошняе, дарэчы, ацэньвалася на аглядзе лагераў і «Каша-Battle». У гэтай намінацыі найлепшымі сталі лагеры юрыдычнага і біялагічнага факультэтаў. У конкурсе ваеннай песні перамогу атрымаў хімічны факультэт. Лідар у конкурсе візітовак і творчым нумары – факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

Спартыўныя спаборніцтвы – неад'емная частка турыстычнага злёту. Каманды змагаліся ў лазертагу, тэхніцы пешаходнага і воднага турызму, спартыўным арыентаванні. Студэнтам трэба было праявіць сваю кемлівасць, спрыт і навыкі для таго, каб пераадолець складаную мясцовасць і знайсці пікеты ці прабрацца праз гразь і праехацца на тросах. У тэхніцы пешаходнага турызму найлепшым стаў БРСМ юрыдычнага факультэта. У спартыўным арыентаванні і тэхніцы воднага турызму – каардынацыйны савет студэнцкага гарадка.

На турзлёт прыехаў прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях **Іван Янушэвіч.** Ён пажадаў студэнтам добрага адпачынку, а ўвечар на дыскатэцы разам з начальнікам УВРМ **Аляксеем Багамазавым** прарэктар паказаў запальны майстар-клас па джамп-стайле.

Ужо які год пераможцам турзлёту становіцца біялагічны факультэт. Так адбылося і на гэты раз! На другім і трэцім месцах аказаліся каардынацыйны савет студгарадка і БРСМ ФРКТ. Сакратар БРСМ БДУ **Канстанцін Андрусевіч** павіншаваў каманды з перамогай і плённай працай на турзлёце.

Кацярына Кавалёва, сакратар БРСМ філфака, падзялілася ўражаннем: «Дзякуй усім велізарнае за гэты турзлёт! Прыемна было ўбачыць, што каманды прыехалі не толькі адпачыць, але і паказаць свае разумовыя здольнасці. Атрымаліся дружныя, пазітыўныя і яркія каманды! Шкада, што часу было так мала: тут ён ляціць непрыкметна».

Сустрэнемся на «Высокім беразе» ў наступным годзе!

Надзея МАРХЕЛЬ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082
ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 07.06.2018 г.
Зак. 612. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123,
Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by